## № 3

### [Рэкамэндацыя, выпісаная А. Бабарэку прафэсарам І. Замоцiным для паступленьня ў БДУ]

А. Бабарэку я памятую па яго студэнцкіх занятках як стараннага студэнта, які выявіў жывую зацікаўленасьць да вывучэньня літаратуры. Апроч таго, мне вядомы А. Бабарэка як адзін з маладых беларускіх літаратурных крытыкаў, які распрацоўвае пытаньні як мінулага, так і сучаснага беларускай мастацкай літаратуры; крытычныя этуды яго выкананы таксама вельмі старэнна, з адзнакамі паступовага росту ў яго літаратурнае асьветы.

Думаю, што А. Бабарэка можа быць карысны і ва ўнівэрсытэцкім выкладаньні ў якасьці асыстэнта, а затым і выкладчыка беларускае літаратуры. Лічу, аднак, неабходным выкананьне аднае ўмовы — уласна паралельнага з асыстэнтурай сыстэматычнага паглыбленьня ім, пад кіраўніцтвам профэсара, ведаў па пытаньнях літаратуразнаўства як шляхам тэорэтычных студый, таксама і шляхам навукова–дасьледчае працы над літаратурным матар’ялам.

*20/IX–1928 г.* Проф. І. ЗАМОЦІН

## № 4

### [Рэкамэндацыя, выпісаная А. Бабарэку прафэсарам М. Піятуховiчам для паступленьня ў БДУ]

Т. Бабарэку я ведаю яшчэ з 1922 г. як вельмі здольнага і стараннага студэнта; ён зварачаў на сябе ўвагу асаблівай зацікаўленасьцю да беларускай літаратуры і заўжды даваў вельмі прадуманыя працы ў галіне яе вывучэньня.

Яшчэ ў гады вучэньня ў БДУ і пасьля сканчэньня яго т. Бабарэка ў друку зьмясьціў цэлы шэраг досьледаў і крытычных прац па беларускай літаратуры, якія выяўляюць, што ён мае сталыя веды ў галіне літаратуразнаўства і валадае яго дасьледчымі мэтадамі.

На падставе вышэйпаданага лічу, што т. Бабарэка можа быць вельмі карысным працаўніком БДУ на пасадзе асыстэнта па катэдры гісторыі беларускай літаратуры.

Проф. ПІОТУХОВІЧ

*30/IX–28 г.*

## № 5

### Показания Адама Бабареко от 23 августа 1930 г. [по „Уголовному делу по обвинению Ластовского В. У. и других“]

11 жніўня 1930 г. мне прад’яўлена сьледчымі органамі ўлады, прадстаўленымі ў Вашай асобе, абвінавачаньне ў прыналежнасьці да контррэволюцыйнай організацыі.